А. А. Янушкевич
А. А. Барташевич
Е. Н. Гавранина

РУССКО-БЕЛОРУССКИЙ СЛОВАРЬ ПО ДЕРЕВООБРАБОТКЕ

А.А.Янушкевич,
А.А.Барташевич,
Е.Н.Гавранина

Русско-белорусский словарь по деревообработке

Рекомендовано Научно-методическим центром учебной книги и средств обучения Министерства образования Республики Беларусь

Минск
Издательство "Дизайн ПРО"
1998

УДК 491.71
ББК 81.2Р-4
Я65

Рецензенты:
Белорусский государственный университет (профессор кафедры Современного белорусского языка доктор филологических наук Л.А.Антонюк); Национальная академия наук Беларуси, кандинат филологических наук, доцент Г.Ф.Вешторт

Янушкевич А.А.,
Барташевич А.А., Гавранина Е.Н.

Я65 Русско-белорусский словарь по деревообработке. — Мн.: Дизайн ПРО, 1998. — 144 с.

ISBN 985-6182-38-7

Словарь включает 2000 слов и терминов, употребляемых в лесозаготовительной и деревообрабатывающей отраслях, а также мебельной промышленности. В словах отмечается ударение, приводятся производные слова, их употребление в речи, даны примеры.

Для студентов, учащихся техникумов, профтехучилищ, инженерно-технических работников, а также широкого круга читателей (учителей, преподавателей ВУЗов, журналистов и др.).

Гос.заказ

УДК 491.71
ББК 81.2Р-4

ISBN 985-6182-38-7

ПРАДМОВА

Дрэваапрацоўчая прамысловасць — адна з найбольш даўніх на Беларусі. Акрамя таго, драўніна як матэрыял паўсямесна выкарыстоўвалася для вырабу розных хатніх прадметаў і ў будаўніцтве. Таму з драўнінай, яе ўласцівасцямі, рознымі спосабамі апрацоўкі, прыладамі, шматлікімі вырабамі з дрэва і г.д. звязаны не толькі сучасная прамысловасць, але і ўсе насельніцтва. А гэта азначае вялікую, як нідзе, самабытную лексіку, перанос традыцыйных тэрміналогій, характэрных для даўняй ручной апрацоўкі дрэва, на сучасную вытворчасць са станкамі-аўтаматамі, што іншы раз вядзе да скажэння сэнсу. У сувязі з гэтым у слоўніку даецца азначэнне тых асобных тэрмінаў, якія маюць новае паходжанне (напрыклад, эрганоміка, дызайн), а таксама тэрмінаў, якія вядомы даўно на бытавым узроўні, але атрымалі афіцыйныя стандартныя азначэнні толькі ў апошнія дзесяцігоддзі (напрыклад, выраб, дэталь, загатоўка, набор, прадукцыя, прамысловасць і г.д.). Акрамя таго, у слоўніку прыведзены азначэнні тых тэрмінаў, якія спецыялісты павінны ведаць і ведаць дакладна (аб відах мэблі, стылях мэблі, дэкаратыўным упрыгожванні і г.д.).

З гісторыі народнага быту і дойлідства вядома многа тэрмінаў, звязаных з дрэвам і дрэваапрацоўкай, якія сёння не ўжываюцца і якія ва ўмовах сучаснай прамысловасці страцілі значэнне. Напрыклад, звязаныя з ужо не існуючымі ручнымі прыладамі, спосабамі апрацоўкі, відамі вырабаў (такімі, як саха, лапці, цапільня, куфар і г.д.). Улічваючы, што слоўнік разлічан на сучасную падрыхтоўку спецыялістаў па дрэваапрацоўцы, падобныя тэрміны, якія маюць гістарычны характар, у слоўнік не ўключаліся.

Аўтары, дарэчы спецыялісты па дрэваапрацоўцы, выказваюць вялікую падзяку рэцэнзентам — прафесару Л.А.Антанюк і дацэнту Г.Ф.Вештарт за слушныя парады, якія садзейнічалі павышэнню якасці слоўніка.

О ПОЛЬЗОВАНИИ СЛОВАРЕМ

Производные от общего корня и близкие по значению слова объединяются в гнезде. Общая часть заглавного слова гнезда отделяется параллельными (//), в производных словах того же гнезда эта неизменная часть слова обозначается знаком ~ (тильда). Например: **СОПРЯ//ГАТЬ** спалучаць; **~женный** спалучаны.

В переводах принята следующая схема разделительных знаков: синонимы отделяются запятой, более отдаленные значения — точкой с запятой, разные значения — цифрами. Например: **ПРЕДМЕТ** 1. прадмет; 2. дысцыпліна. Синонимичные варианты в отдельных примерах помещены в круглые скобки. Например: чыставое (канчатковае) шліфаванне.

На всех русских и белорусских словах ставится ударение. Знак ударения не ставится над односложными словами, словами с ударениями на "ё" и в определениях.

Русские слова даются большими жирными буквами, переводные белорусские и определения — обычными строчными. Определения даются только на белорусском языке.

Имена существительные даются в именительном падеже единственного числа, за исключением случаев, когда они употребляются только во множественном числе. После белорусских переводов имен существительных указывается форма родительного падежа с последним изменяемым согласным основы слова, а также род (*м.* — мужской; *ж.* — женский; *ср.* — средний). Формы родительного падежа белорусских существительных приводятся полностью в тех

случаях, когда слово односложное. Если существительное не склоняется, после него приводится пометка (нескл.).

При повторении заглавного слова оно обозначается буквой с точкой.

Если слово имеет несколько значений, а в словаре дается только одно, то указывается, в какой области употребляется слово (хим. — химия, техн. — техника, биол. — биология).

АБ КАРЫСТАННІ СЛОЎНІКАМ

Вытворныя ад агульнага кораня і блізкія па значэнню словы аб'ядноўваюцца ў гняздзе. Агульная частка загаловачнага слова гнязда аддзяляецца паралельнымі лініямі (//), у вытворных словах таго самага гнязда гэта нязменная частка слова абазначаецца знакам ~ (тыльда). Напрыклад: **СОПРЯ//ГАТЬ** спалучаць; **~женный** спалучаны.

У перакладах прынята наступная схема раздзяляльных знакаў: сінонімы аддзяляюцца коскай, больш аддаленыя значэнні — кропкай з коскай, розныя значэнні — лічбамі. Напрыклад: **ПРЕДМЕТ** 1. прадмет; 2. дысцыпліна. Сінанімічныя варыянты ў асобных прыкладах змешчаны ў круглыя дужкі. Напрыклад: чыставое (канчатковае) шліфаванне.

Націск ставіцца над ўсімі рускімі і беларускімі словамі. Не ставіцца націск над аднаскладовымі словамі, а таксама над словамі з націскным "ё" і ў азначэннях.

Рускія словы даюцца вялікімі жырнымі літарамі, перакладныя беларускія і азначэнні — звычайнымі малымі. Азначэнні даюцца толькі на беларускай мове.

Назоўнікі даюцца ў назоўным склоне адзіночнага ліку, апрача выпадкаў, калі яны ўжываюцца толькі ў множным ліку. Пасля беларускіх перакладаў назоўнікаў вызначаецца форма роднага склону з апошнім нязменным зычным асновы слова, а таксама род (*м.* — мужчынскі; *ж.* — жаночы; *н.* — ніякі). Формы роднага склону беларускіх назоўнікаў даюцца цалкам у тых выпадках, калі слова аднаскладовае. Калі назоунік не скланяецца, пасля яго даецца памета (нескл.).

Пры паўтарэнні загаловачнага слова яно абазначаецца вялікай літарай з кропкай пасля яе.

Калі слова мае некалькі значэнняў, а ў слоўніку даецца толькі адно, тады ўказваецца, у якой галіне ўжываецца слова (хим. — хімія, техн. — тэхніка, биол. — біялогія).

УСЛОВНЫЕ СОКРАЩЕНИЯ

биол. — биология
бот. — ботаника
ж. — женский род
м. — мужской род
мех. — механика
мн. — множественное число
мног. — о многом, о многих (предметах, явлениях)
нареч. — наречие
род. — родительный падеж
ср. — средний род
техн. — техника
хим. — химия

Русский алфавит

Аа	Кк	Хх
Бб	Лл	Цц
Вв	Мм	Чч
Гг	Нн	Шш
Дд	Оо	Щщ
Ее	Пп	Ъъ
Ёё	Рр	Ыы
Жж	Сс	Ьь
Зз	Тт	Ээ
Ии	Уу	Юю
Йй	Фф	Яя

А

АБРАЗИ́ВНЫЙ абразі́ўны.

АБСОЛЮ́ТНО *нареч.* абсалю́тна; **а. сухое состояние** абсалютна сухі стан.

АБСОЛЮ́ТН//ЫЙ абсалю́тны; **~ая влажность** абсалю́тная вільготнасць.

АВТОКА́Р аўтака́ры, -раў, *ед.* нет.

АВТОЛЕСОВО́З аўталесаво́з, -за, *м.*

АВТОМА́Т аўтама́т, -та, *м.* Машына, якая выконвае работу без удзелу чалавека.

АВТОМАТИЗА́ЦИЯ аўтаматыза́цыя, -цыі, *ж.*

АВТОМАТИ́ЧЕСК//ИЙ аўтаматы́чны; **~ая линия** аўтаматы́чная лінія. Сістэма агрэгатаў ці машын, злучаных транспартным прыстасаваннем, якое ў пэўнай паслядоўнасці пераносіць вырабы ад адной машыны да другой і забяспечвае разам з каманднымі прыстасаваннямі іх апрацоўку.

АВТОМАШИ́НА аўтамашы́на, -ны, *ж.*

АВТОПОГРУ́ЗЧИК аўтапагру́зчык, -ка, *м.* Самарухальная машына для пагрузкі, разгрузкі і перавозкі грузаў.

АВТОЎКЛА́ДЧИК аўтаўкла́дчык, -ка, *м.*

АГРЕГА́Т аґрэга́т, -та, *м.* Злучэнне некалькіх разнатыпных машын для агульнай работы.

АДАПТА́ЦИЯ адапта́цыя, -цыі, *ж.* А. (да святла) — зніжэнне адчувальнасці вока да

колеру пры вялікай асветленасці. А. (да цемнаты) — павышэнне адчувальнасці вока да колеру пры малой асветленасці.

АДСОРБЕ́НТ адсарбе́нт, -ту, *м.*

АДСО́РБЦИЯ адсо́рбцыя, -цыі, *ж.*

АККУМУЛИ́РОВАНИЕ акумулі́раванне, -ння, *ср.*

АКРИ́ЛОВ//ЫЙ акры́лавы (хим.); **~ая кислота** акры́лавая кіслата.

АЛЬБУМИНОКАЗЕИ́НОВЫЙ альбумінаказеінавы; **а. клей** альбумінаказеінавы клей.

АМПЕ́Р ампе́р, -ра, *м.*

АМПЕРМЕ́ТР амперме́тр, -ра, *м.*

АМПЛИТУ́Д//А амплiту́да, -ды, *ж*; **~ный** амплiту́дны.

АНА́ЛИЗ ана́ліз, -зу, *м.*

АНА́ЛОГ ана́лаг, -гу, *м.* Прадмет, падобны да таго, што праектуецца або ацэньваецца.

АНЕМО́МЕТР анемо́метр, -ра, *м.*

АНИЛИ́Н анілі́н, -ну, *м.*(хим.).

АНИЛОКРАСИ́ТЕЛЬ аніпафарбава́льнік, -ку, *м.*(хім.).

АННОТА́ЦИЯ аната́цыя, -цыі, *ж.*

АНТИСЕПТИ́РОВАНИЕ антысептава́нне, -ння, *ср.*; **а. пиломатериалов** антысептаванне піламатэрыялаў.

АНТРОПОМЕТРИ́Я антрапаме́трыя, -рыі, *ж.* Галіна навукі аб чалавеку, якая займаецца

вымярэннямі чалавечага цела і яго частак. На даных а. асноўваецца стандартызацыя прадметаў, абслугоўваючых чалавека, а таксама рацыянальнае абсталяванне рабочых месцаў.

АППАРА́Т апарбт, -та, *м.*

АППЛИКА́ЦИЯ аплікбцыя, -цыі, *ж.* Спосаб атрымання адлюстравання шляхам накладання (наклейвання) яго частак на фон, на аснову, на поле.

АПРОБИ́РОВАНИЕ апрабавбнне, -ння, *ср.*

АССОРТИМЕ́НТ асартымйнт, -ту, *м.* Састаў і суадносіны асобных відаў вырабаў пры выпуску прадукцыі альбо ў сферы спажывання.

АТМОСФЕ́РА атмасфйра, -ры, *ж.*

АТМОСФЕ́РН//ЫЙ атмасфйрны; **-ая сушка** атмасфйрная сушка.

АТМОСФЕРОСТО́ЙКИЙ атмасферастуйкі.

АТМОСФЕРОЎСТО́ЙЧИВЫЙ атмасфераўстуйлівы.

АЦЕТО́Н ацэтун, -ну, *м.*(хим.).

АЭРОДИНА́М//ИКА аэрадынбміка, -кі, *ж.*; **~и́ческий** аэрадынамнны.

Б

БА́БКА бббка, -кі, *ж.*(техн., в станке).

БАГЕ́Т багйт, -ту, *м.*; **~ный** багйтны, багйтавы.

БАГО́Р баго́р, -гра́, *м.* Шост з металічным крукам і вастрыём (скарыстоўваецца на сплаве лесу, пры тушэнні пажару і г.д.).

БА́ЗА ба́за, -ы, *ж*; **сырьевая б.** сыравінная база.

БАЛА́НС бала́нс, -су, *м.*

БАЛАНСИРО́ВОЧН//ЫЙ балансіро́вачны.

БА́ЛКА бэ́лька, -кі, *ж.*

БАЛЯ́СИНА баля́са, -сы, *ж*; баля́сіна, -ны, *ж.* Точаны фігурны слупок поручняў.

БАССЕ́ЙН басе́йн, -на, *м.* Штучны або прыродны вадаём; вадазабор.

БАШМА́К башма́к, -ка, *м.*

БЕЗДЕФЕ́КТНЫЙ бездэфе́ктны.

БЕЛОСТВО́ЛЬНЫЙ беластво́лы.

БЕРЕ́ЗА бяро́за, -зы, *ж.*

БЛЕСК 1. бляск, *род.* бля́ску, *м*; 2. бліск, *род.* бліску, *м.*

БЛОК блок, *род.* блока, *м.*

БЛО́ЧНЫЙ бло́чны, бло́кавы.

БОКОВО́Й бакавы́.

БОЛВА́НКА балва́нка, -кі, *ж.* 1. Злітак металу, атрыманы пасля разліўкі яго ў формы. 2. Кавалак жалеза, дрэва, прыгатаваны для вырабу чаго-небудзь.

БОЛТ 1. болт, *род.* бо́лта, *м*; 2. ніт, *род.* ніта.

БОН бон, *род.* бо́на, *м.* Плывучая перашкода з бярвённяў і інш. на рэках або азёрах.

БОНДА́Р//ИТЬ бандáрыць; **~ный** бандáрны; **~ня** бандáрня, -ні, *ж*.

БО́НДАРЬ бóндар, -ра, *м*. Рабочы, які вырабляе бочкі.

БО́ЧКА бóчка, -кі, *ж*.

БРАК брак, -ку, *м*. Сапсаваная прадукцыя. Псаванне, пашкоджанне прадукцыі.

БРАКЁР бракёр, -ра, *м*.

БРАКОВА́ТЬ бракавáць.

БРАКО́ВКА бракавáнне, -ння, *ср*, бракоўка, -кі, *ж*.

БРЕВ//Е́НЧАТЫЙ з бярвéння (сделанный в сруб) рýблены; **~но** *ср*. бервянó, -на, *ср*, *мн*. бярвéнні, -нняў

БРЁВНОЎКЛА́ДЧИК . бярвёнаўклáдчык, -ка, *м*.

БРИГА́ДА брыгáда, -ды, *ж*.

БРИКЕ́Т брыкéт, -ту, *м*. Плітка (пліткі) якога-небудзь спрасаванага матэрыялу. Напрыклад, пілавіння.

БРИКЕТИ́РОВАТЬ брыкетавáць.

БРУС брус, -са, *м*. Доўгі двух-, трох-, чатырохкантовы кавалак дрэва, таўшчынёй 100 мм і больш.

БРУСКО́ВЫЙ бру́скóвы.

БРУСО́К брусóк, -ска, *м*.

БУГРИ́СТЫЙ (неровный) гузавáты, шышкавáты.

БУКСИ́Р//ОВАТЬ буксіраваць; **~óвка** буксіруўка, -кі, *ж.*

БУК бук, *род.* буку, *м.*(бот.).

БУМА́ГА папéра, -ры, *ж.* Матэрыял для пісьма і іішы х мэт, выраблеіы з драўіяіаé і ііш аé масы.

БУМАГОРÉЗАТЕЛЬНЫЙ папераpэ́залыіы.

БУМА́ЖНЫЙ папярувы.

БУ́НКЕР бэікер, -ра, *м.* Ёмістасць, спецыяльіа прыстасаваіая для захоўваііяя сыпкіх матэрыялаў. Б. для пілавііія.

БУ́ФЕР бэфер, -ра, *м.*

В

ВАГÓН вагуі, -іа, *м.*

ВАГОНÉТКА вагаі éтка, -кі, *ж.*

ВА́ЙМА вбéма, -мы, *ж.*

ВА́КУУМНЫЙ вбкуумііы.

ВАЛ вал, *род.* вбла, *м.*

ВАЛÉЦ валéц, *род.* вальцб, *м.*

ВАЛЬ//ЦЕВА́НИЕ вальцавбіііе, -ііія , *ср.*, **~цева́ть** вальцавбць; **~цóванный** вальцавбіы; **~цóвка** вальцавбіііе, -ііія *ср.*, вальцуўка, -кі, *ж.*(техі.).

ВА́ННА вбііа, -ііы , *ж.*: **в. для антисептирования досок** вбііа для аітысептаваііія душак.

ВА́ТА вбта, -ты, *ж.*

ВАТИ́Н ваці́н, -ну, *м.*

ВДОЛЬ *нареч.* удо́ўж, уздо́ўж.

ВЕ́ДОМОСТЬ ве́дамасць, -ці, *ж.*

ВЕНТИЛИ́РОВА//НИЕ вентылі́раванне, -ння, *ср.*; ~**ть** вентылі́раваць.

ВЕНТИЛЯ́ТОР вентыля́тар, -ра, *м.*

ВЕРЁВКА вяро́ўка, -кі, *ж.*

ВЕРСТА́К варшта́т, -та, *м.*(техн.).

ВЕРШИ́НА вяршы́ня, -ні, *ж.*

ВЕ́СИТЬ ва́жыць.

ВЕСОВО́Й ва́гавы.

ВЕСЫ́ *ед. нет* вага́, -гі, *ж.*, *мн.* ва́гі, -гаў, (с коромыслом) ша́лі, -ляў, *ед. нет.*

ВЕТВИ́//СТОСТЬ галіна́стасць, -ці, *ж.*; ~**стый** галіна́сты.

ВЕ́ТКА галі́на, -ны, *ж.* Бакавы адростак дрэва; сук з веццем.

ВЕЧНОЗЕЛЁНЫЙ вечназялёны.

ВЕ́ШАЛКА ве́шалка, -кі, *ж.*

ВЕЩЕСТВО́ рэ́чыва, *ср.*; (материя) матэрыя, -рыі, *ж.*

ВЗАИМОЗАМЕНЯ́ЕМОСТЬ узаемазамяня́льнасць, -ці, *ж.*

ВЗВЕ́СИТЬ узва́жыць.

ВЗДУ́ТЬСЯ (набухнуть) набра́кнуць.

ВИБРА́ЦИЯ вібра́цыя, -цыі, *ж.*; дрыжа́нне, -ння, *ср.*, хіста́нне.

ВИД від, *род.* ві́ду, *м.*

ВИНТ *м.* шру́ба, -бы, *ж.*

ВКОСЬ *нареч.* накася́к. Не прама, па дыяганалі, з вугла на вугал.

ВЛА́ГА ві́пьгаць, -ці, *ж.*

ВЛАГОЁМКИЙ вільгацяёмісты.

ВЛАГОЗАЩИ́ТА вільгацеахо́ва, -вы, *ж.*

ВЛАГОИЗОЛЯ́ЦИЯ вільгацéізаляцыя, -цыі, *ж.*

ВЛАГОПРОВО́ДНОСТЬ вільгацеправо́днасць, -ці, *ж.*

ВЛАГОСТО́ЙК//ИЙ вільгацеўсто́йлівы; **~ость** вільгацеўсто́йлівасць, -ці, *ж.*

ВЛА́ЖНОСТЬ вільго́тнасць, -ці, *ж.* Ступень насычанасці вільгаццю.

ВЛИЯ́НИЕ ўплы́ў, -лы́ву, *м.*

ВМЕСТИ́МОСТЬ ёмістасць, -ці, *ж.* Здольнасць змясціць у сабе пэўную колькасць чаго-небудзь; умяшчальнасць, унутраны аб'ём (ёмістасць рэзервуара).

ВМЕЩ//А́ТЬ умяшча́ць, **~аться** умяшча́цца.

ВМЯ́//ТИНА, **~тость** увагну́тасць, -ці, *ж*; **~тый** 1. умя́ты, уці́снуты; 2. увагну́ты; **~ть** 1. умя́ць, уці́снуць; 2. (сделать вмятину) увагну́ць.

ВНАКЛА́ДКУ *нареч.* унакла́дку.

ВНЕ́ШНИЙ во́нкавы, знадво́рны; (окружающий) навако́льны, зне́шні.

ВНИМА́НИЕ ува́га, -гі, *ж.*

ВНУ́ТРЕННИЙ уну́траны.

ВНУТРИ́ 1. *нареч.* усярэ́дзіне; унутры́; 2. *предлог с род.* усярэ́дзіне (каго-чаго); унутры́ (каго-чаго).

ВНУТРИОТРАСЛЕВО́Й унутрыгаліно́вы.

ВНУТРИПРОИЗВО́ДСТВЕННЫЙ унутрывытво́рчы.

ВНУТРИСОРТОВО́Й унутрысартавы́.

ВНУТРЬ *нареч.* усярэ́дзіну; уну́тр.

ВО́ВРЕМЯ *нареч.* у час, своечасо́ва, у пару́.

ВО́ГНУТОСТЬ увагну́тасць, -ці, *ж.*, угну́тасць, -ці, *ж.*

ВОДА́ вада́, -ды, *ж.*

ВОДОЁМ вадаём, -ма, *м.*

ВОДОЗАЩИ́ТНЫЙ водаахо́ўны.

ВОДОКА́ЧКА вадака́чка, -кі, *ж.*

ВОДОНЕПРОНИЦА́ЕМ//ОСТЬ воданепраніка́льнасць, -ці, *ж.*; **~ый** воданепраніка́льны.

ВОДООЧИ́СТКА водаачы́стка, -кі, *ж.*

ВОДОПРОНИЦА́ЕМОСТЬ водапраніка́льнасць, -ці, *ж.*

ВОДОРАСТВОРИ́МЫЙ водараствара́льны.

ВОДОСНАБЖЕ́НИЕ водазабеспячэ́нне, -ння, *ср.*

ВОДОСОДЕРЖА́ЩИЙ водазмяшча́льны.

ВОДОСТО́ЙК//ИЙ водаўсто́йлівы; **~ость** водаўсто́йлівасць, -ці, *ж.*

ВОЗВРА́Т зваро́т, -ту, *м.*
ВОЗВРА́ТНО-ПОВОРО́ТНЫЙ зваро́тна-паваро́тны.
ВОЗВРА́ТНО-ПОСТУПА́ТЕЛЬНЫЙ зваро́тна-паступа́льны.
ВОЗГОРА́ЕМОСТЬ узгара́льнасць, -ці, *ж.*
ВОЗДЕ́ЙСТВИЕ ўздзе́янне, -ння, *ср.*; (влияние) уплы́ў, -лы́ву, *м.*
ВО́ЗДУХ паве́тра, -ра, *ср.*
ВОЗДУХОВО́Д паветраво́д, -да, *м.*
ВОЗДУХОНАГРЕВА́ТЕЛЬ паветранагрява́льнік, -ка, *м.*
ВОЗДУХОПРОВО́Д паветраправо́д, -да, *м.*
ВОЗДУХОПРОНИЦА́ЕМОСТЬ паветрапраніка́льнасць, -ці, *ж.*
ВОЗНИК//А́ТЬ узніка́ць, вынiка́ць, паўстава́ць; **~нове́ние** узнікне́нне, -ння, *ср.*
ВО́ЗРАСТ узро́ст, -ту, *м.*
ВО́ЙЛОК ля́мец, -мцу, *м.*
ВОЛОКН//О́ валакно́, -на, *ср.*; **~и́стость** валакні́стасць, -ці, *ж.*; **~и́стый** валакні́сты.
ВОЛНА́ хва́ля, -лі, *ж.*; **звуковая в.** гукавая хваля.
ВОЛНИ́СТЫЙ хва́лісты, хвалепадо́бны.
ВОПРО́С пыта́нне, -ння, *ср.*
ВОРС ворс, -су, *м.*; **~и́стый** варсі́сты.
ВОСПО́ЛЬЗОВАТЬСЯ скарыста́ць, вы́карыстаць (што).

ВОЩÉНИЕ вашчэ́нне, -ння, *ср.*; васкава́нне, -ння, *ср.*

ВПА́ДИНА ўпа́дзіна, -ны, *ж.*; я́міна, -ны, *ж.*

ВПЕРВЫ́Е ўпершыню́.

ВРÉДНОСТЬ шкóднасць, -ці, *ж.*

ВРÉМЯ час, *род.* ча́су, *м.*

ВСЕСТОРÓННЕ *нареч.* усебакóва.

ВСТРÓЕННЫЙ убудава́ны.

ВСТЫК *нареч.* усты́к.

ВТИРА́НИЕ (действие) ушіра́нне, -ння, *ср.*

ВТОРИ́ЧНО *нареч.* паўтóрна; **второй раз** другí раз, другíм ра́зам.

ВТОРИ́ЧНЫЙ (повторный) другаразóвы; (производный, зависимый) друга́сны; (второстепенный) другара́дны; (побочный) пабóчны.

ВТУ́ЛКА ўту́лка, -кі, *ж.*

ВХОЛОСТУ́Ю ўхаласту́ю; дарэ́мна, ма́рна.

ВЫБÓИНА *ж.* (углубление) выбóіна, -ны, *ж.*

ВЫ́БОР вы́бар, -ру, *м.*

ВЫ́ВЕЗТИ вы́везці, *мног.* павывóзіць.

ВЫ́ВИНТИТЬ вы́круціць, *мног.* павыкру́чваць.

ВЫВИ́НЧИВАНИЕ выкру́чванне, -ння, *ср.*

ВЫ́ВОЗ вы́ваз, -зу, *м.*

ВЫГНИВА́НИЕ выгніва́нне, -ння, *ср.*

ВЫ́ГНУ//ТОСТЬ вы́гнутасць, -ці, *ж.*; **~тый** вы́гнуты; **~ть** вы́гнуць.

ВЫГРУЖА́ТЬ выгружа́ць.

ВЫГРУЖА́ТЕЛЬ выгружа́льнік, -ка, *м.*

ВЫ́ГРУЖЕННЫЙ вы́гружаны, *мног.* павыгружа́ны.

ВЫ́ГРУЗКА вы́грузка, -кі, *ж.*

ВЫ́Д//АВИТЬ вы́цiснуць; **~а́вливание** выціска́нне, -ння, *ср.*; **~а́вливать** выціска́ць.

ВЫДА́ЛБЛИВА//НИЕ выдзёўбванне, -ння, *ср.*; **~ть** выдзёўбваць.

ВЫДВИГА́НИЕ высо́ўванне, -ння, *ср.*; выця́гванне, -ння, *ср.*

ВЫДВИГА́ТЬ высо́ўваць, выця́гваць; **вытягивать ящик из стола** выцягваць шуфляду са стала.

ВЫДВИЖНО́Й высо́ўны.

ВЫДЁРГИВА//НИЕ вырыва́нне, -ння, *ср.*; **~ть** вырыва́ць, выдзіра́ць, выця́гваць.

ВЫ́ДЕРЖКА вы́трымка, -кі, (техн.); **технологическая выдержка** тэхналагічная вытрымка.

ВЫЖИГА́НИЕ выпа́льванне, -ння, *ср.*

ВЫКЛЮЧА́ТЕЛЬ выключа́льнік, -ка, *м.*

ВЫКРУ́ЧИВАНИЕ выкру́чванне, -ння, *ср.*

ВЫМА́ЧИВАНИЕ вымо́чванне, -ння, *ср.*

ВЫ́ПИЛЕННЫЙ выпілава́ны, *мног.* павыпіло́ўваны, вы́разаны, *мног.* павы́разаны.

ВЫПИ́ЛИВА//НИЕ выпіло́ўванне, -ння, *ср.*, выраза́нне, -ння, *ср.*; **~ть** выпіло́ўваць, выраза́ць; **~ться** выпіло́ўвацца, выраза́цца.

ВЫ́ПИЛ//ИТЬ вы́пілаваць, *мног.* павыпіло́ўваць, выраза́ць, *мног.* павыраза́ць; **~ка, ~о́вка** *ж.* выпіло́ўванне, -ння, *ср.*, выпіло́ўка, -кі, *ж.*; **~о́вочный** выпіло́вачны.

ВЫПОЛИРОВА//ННЫЙ вы́паліраваны, адпаліра́ваны; **~ть** вы́паліраваць, адпаліра́ваць; **~ться** вы́паліравацца, адпаліра́вацца.

ВЫПОЛНЕ́НИЕ выкана́нне, -ння, *ср.*; здзяйсне́нне, -ння, *ср.*

ВЫ́ПОЛН//ЕННЫЙ вы́кананы; здзе́йснены; зро́блены; **~и́мость** выкана́льнасць, -ці, *ж.*; **~и́мый** выкана́льны; **~и́тель** выкана́ўца, -цы, *м.*

ВЫ́ПУКЛ//ОСТЬ вы́пукласць, -ці, *ж.*, пука́тасць, -ці, *ж.*; **~ый** вы́пуклы, пука́ты.

ВЫ́ПУСК вы́пуск, -ку, *м.*

ВЫРА́ВНИВАНИЕ выраўно́ўванне, -ння, *ср.*

ВЫ́РАЖЕННОСТЬ вы́яўленасць, -ці, *ж.*

ВЫСОКОАВТОМАТИЗИ́РОВАННЫЙ высокааўтаматызава́ны.

ВЫСОКОКА́ЧЕСТВЕННЫЙ высокая́касны.

ВЫСОКОПРОИЗВОДИ́ТЕЛЬНЫЙ высокапрадукцы́йны.

ВЫСОКОПРО́ЧНЫЙ высокатрыва́лы.

ВЫСОКОТОКСИ́ЧНЫЙ высокатаксі́чны.

ВЫСОКОЧАСТО́ТНЫЙ высокачасто́тны.

ВЫСОКОЭЛАСТИ́ЧНЫЙ высокаэласты́чны.

ВЫСОТА́ вышыня́, -ні, *ж.*

ВЫ́СУШЕННЫЙ вы́сушаны, *мног.* павысу́шваны.

ВЫТА́ЧИВАТЬ вытóчваць.
ВЫТИРА́ТЬ выцірáць.
ВЫ́ТЯЖКА вы́цяжка, -кі, *ж.*
ВЫ́ХОД вы́хад, -ду, *м.* Колькасць прадукцыі, якая атрымана на адзінку сыравіны.
ВЫЧЕ́РЧИВА//НИЕ вычэ́рчванне, -ння, *ср.*; **~ть** вычэ́рчваць.
ВЯ́З//КИЙ вя́зкі; ліпкі, кле́йкі; **~кость** вя́зкасць, -ці, *ж.*; ліпкасць, -ці, *ж.*, кле́йкасць, -ці, *ж.*

Г

ГАБАРИ́Т габары́т, -ту, *м.* Знешнія абрысы прадметаў (машын, вагонаў, будынкаў і інш.); памер, велічыня чаго-небудзь.
ГАЗОВОЗДУ́ШНЫЙ газапаве́траны.
ГАЗОГЕНЕРА́ТОР газагенерáтар, -ра, *м.* Апарат для ператварэння цвёрдага або вадкага паліва ў гаручы газ.
ГАЗОКА́МЕРА газакáмера, -ры, *ж.*
ГА́ЙКА гáйка, -кі, *ж.*
ГАЛСТУКОДЕРЖА́ТЕЛЬ гальштукатрымáльнік, -ка, *м.*
ГАЛТЕ́ЛЬ галтэ́ль, -ля, *м.* Дэкаратыўны элемент у выглядзе паглыблення, якое выбрана на вонкавай паверхні дэталі.
ГАЛЬВАНО́МЕТР гальванóметр, -ра, *м.*

ГАРДЕРО́Б гардэро́б, -ба, *м.* 1. Шафа для адзення. 2. Месца ў грамадскім памяшканні для захоўвання верхняга адзення; раздзявальня. 3. Адзенне аднаго чалавека (гардэроб артыста).

ГАРНИТУ́Р гарніту́р, -ра, *м.* Камплект прадметаў пэўнага прызначэння (гарнітур мэблі, сталовы гарнітур).

ГАРНИТУ́РНЫЙ гарніту́рны.

ГВОЗДЕВО́Й цвіко́вы.

ГВО́ЗДИК цвічо́к, -чка, *м.*, (деревянный) гваздо́к, -дка, *м.*

ГВОЗДОДЁР цвікадзёр, -ра, *м.*(техн.).

ГВОЗДЬ 1. (металлический) цвік, *род.* цвіка́, *м.*; 2. (деревянный) гвозд, *род.* гвазда́, *м.* Металічны або драўляны завостраны стрыжань.

ГЕНЕРА́ТОР генера́тар, -ра, *м.*; **~ный** генера́тарны; **~ный газ** генератарны газ (техн.).

ГЕНПЛА́Н (геренера́льный план) генпла́н (генера́льны план), -на, *м.*

ГЕРМЕТИЗА́ЦИЯ герметыза́цыя, -цыі, *ж.*

ГЕРМЕТИ́ЧНЫЙ герметы́чны. Які наглуха закрываецца і зусім не прапускае вадкасці і газу (герметычныя дзверы).

ГИ́Б//КИЙ гібкі, гну́ткі; **~кость** гібкасць, -ці, *ж.*

ГИГРОСКО́П гіграско́п, -па, *м.*; **~и́ческий** гіграскапічны.

ГИДРА́ВЛ//ИКА гідра́ўліка, -кі, *ж.*; **~и́ческий** гідраўлі́чны (мех.). Навука аб законах раўнавагі і руху вадкасцей і спосабах практычнага прымянення гэтых законаў.

ГИДРА́НТ гідра́нт, -та, *м.*

ГИДРОДИНА́МИКА гідрадына́міка, -кі, *ж.*

ГИДРО́ЛИЗ гідро́ліз, -зу, *м.* (хим.).

ГИДРОПРИ́ВОД гідрапры́вод, -да, *м.*

ГЛА́ДКИЙ гла́дкі.

ГЛАЗОМЕ́Р вакаме́р, -ра, *м.*

ГЛУБИНА́ глыбіня́, -ні́, *ж.*

ГЛЯ́НЕЦ гля́нец, -нцу, *м.*

ГЛЯ́НЦЕВЫЙ гля́нцавы.

ГЛЮТИ́НОВЫЙ глюці́навы; **г. клей** глюцінавы клей.

ГНИЕ́НИЕ гніе́нне, -ння, *ср.*; гніццё, -цця́, *ср.*

ГНИЛЬ гніль, -лі, *ж.*

ГОБЕЛЕ́Н габеле́н, -на, *м.* 1. Насценны дыван ручной работы з вытканай на ім карцінай; 2. Дэкаратыўная ўзорыстая тканіна.

ГОДИ́ЧНЫЙ гадавы́; **г. слой древесины** гадавы слой драўніны.

ГО́ДНОСТЬ прыго́днасць, -ці, *ж.*, прыда́тнасць, -ці, *ж.*

ГОЛО́ВКА (у гвоздя и т.п.) пле́шка, -кі, *ж.*

ГОНТ го́нта, -ты, *ж.* Дахавы матэрыял у выглядзе невялікіх дошчачак, востра застruганых з аднаго боку і з пазам — з другога.

ГОРБЫ́ЛЬ апо́лак, -лка, *м.* (техн.). Крайні, з адваго боку выпуклы піламатэрыял, які атрымліваецца пры распілоўцы ўдоўж.

ГОРЕ́НИЕ гарэ́нне, -ння, *ср.*

ГОРЮ́ЧЕСТЬ гару́часць, -ці, *ж.*

ГОРЯЧЕПРЕССО́ВАННЫЙ гарачапрасава́ны.

ГОСТИ́НАЯ гасці́ная, -най, *ж.*

ГРАБ граб, -ба, *м.*

ГРА́БОВЫЙ гра́бавы.

ГРАДА́ЦИЯ града́цыя, -цыі, *ж.*

ГРАДИЕ́НТ градые́нт, -та, *м.*; **г. влажности** градыент вільготнасці.

ГРА́ДУС гра́дус, -са, *м.*

ГРА́ДУСНИК гра́дуснік, -ка, *м.*

ГРАММ грам, *род.* гра́ма, *м.*

ГРАНЬ грань, *род.* гра́ні, *ж.* 1. Лінія, граніца, якая раздзяляе што-небудзь. 2. Адна плоскасць ломанай паверхні цела, старана геаметрычнай фігуры (грані куба). 3. Рабро, якое ўтвараецца на месцы перасячэння двух плоскасцяў (рабро дошкі).

ГРАФА́ графа́, -фы́, *ж.*

ГРА́ФИК гра́фик, -ка, *м.* 1. Дыяграма, якая пры дапамозе ліній паказвае стан, развіццё чаго-небудзь. Графік росту прамысловай прадукцыі. 2. План работ з дакладнымі паказчыкамі норм і часу выканання.

ГРАФИ́ЧЕСКИ графі́чна.

ГРЕ́ЙФЕР грэ́йфер, -ра, *м.* Прыстасаванне, механизм для захвату грузаў.
ГРОМО́ЗДКИЙ груваcткі, гру́зны, вялі́кі.
ГРУЗ груз, *род.* гру́зу, *м.*
ГРУЗОПОДЪЁМН//ИК грузапад'ёмнік, -ка, *м.*, грузападыма́льнік, -ка, *м.*; **~ость** грузапад'ёмнасць, -ці, *ж.*, грузападыма́льнасць, -ці, *ж.*; **~ый** грузапад'ёмны, грузападыма́льны (техн.).
ГРУ́ЗЧИК гру́зчык, -ка, *м.*
ГРУНТ//ОВА́НИЕ грунтава́нне, -ння, *ср.*; **~ова́ть** грунтаваць; **~о́вка** грунто́ўка, -кі, *ж.*

Д

ДАВЛЕ́НИЕ ціск, *род.* ціску, *м.* Сіла, дзеючая на якую-небудзь паверхню.
ДА́ННЫЕ да́ныя, -ных, *мн.*
ДВЕРЬ дзве́ры, дзвярэ́й *ед. нет.*
ДВИ́ГАТЕЛЬ рухаві́к, -ка, *м.*
ДВУХСПА́ЛЬНЫЙ двухспа́льны.
ДВУХСТВО́РЧАТЫЙ двухство́ркавы.
ДВУХСТОРО́ННИЙ двухбако́вы.
ДВУХЭТА́ЖНЫЙ двухпавярхо́вы.
ДВУШПИ́НДЕЛЬНЫЙ двухшпіндэльны.
ДЕ́ЙСТВИЕ дзе́янне, -ння, *ср.*
ДЕКО́Р дэко́р, -ра, *м.*; **~ати́вный** дэкараты́ўны. Д. — сукупнасць элементаў вонкавага віду прадмета, прызначаных для яго ўпрыгожвання.

ДЕКАРАТИ́ВНОСТЬ (свойство) дэкаратыўнасць, -ці, *ж.*

ДЕ́ЛАТЬ рабіць,

ДЕ́РЕВО дрэ́ва, -ва, *ср.*

ДЕРЕВООБРАБ//А́ТЫВАЮЩИЙ дрэваапрацо́ўчы; **~о́тка** дрэваапрацо́ўка, -кі, *ж.*

ДЕРЕВОРЕ́ЖУЩИЙ дрэварэ́зальны.

ДЕРЕВЯ́ННЫЙ драўля́ны.

ДЕРЖА́ТЕЛЬ трыма́льнік, -ка, *м.*

ДЕРЖА́ТЬ трыма́ць.

ДЕСО́РБЦИЯ дэсо́рбцыя, -цыі, *ж.*

ДЕТА́ЛЬ дэта́ль, -лі, *ж.*

ДЕФЕ́КТ дэфе́кт, -ту, *м.*; **~ный** дэфе́ктны.

ДЕФОРМ//А́ЦИЯ дэфарма́цыя, -цыі, *ж.* **~и́рование** дэфармава́нне, -ння, *ср.*; **~и́рованный** дэфармава́ны; **~и́ровать** дэфармава́ць; **~и́роваться** дэфармава́цца.

ДЕШЕ́ВЛЕ *нареч.* танне́й; *прил.* танне́йшы.

ДЁГОТЬ дзёгаць, -гцю, *м.* Цёмная густая вадкасць — прадукт сухой перагонкі драўніны, торфу, каменнага вуглю.

ДИАГРА́ММА дыягра́ма, -мы, *ж.*

ДИВА́Н кана́па, -пы, *ж.* Від мэблі для сядзення і ляжання (са спінкай і падлакотнікамі).

ДИВА́Н-КРОВА́ТЬ кана́па-ло́жак, кана́пы-ло́жка, *м.*

ДИВА́ННЫЙ кана́пны, кана́павы.

ДИВА́НЧИК кана́пка, -кі, *ж.*

ДИЗА́ЙН дыза́йн, -на, *м*. Від творчай дзейнасці, галоўнай мэтай якой з'яўляецца стварэнне гарманічнага асяроддзя, задавальняючага матэрыяльныя і духоўныя запатрабаванні.

ДИНАМИ́ЧЕСКИЙ дынамі́чны.

ДИНАМО́МЕТР дынамо́метр, -ра, *м*.

ДИСК дыск, *род*. ды́ска, *м*.

ДИ́СКОВ//ЫЙ ды́скавы; **~ая пила** ды́скавая піла.

ДИСПЕ́РСИЯ дыспе́рсія, -сіі, *ж*.

ДИСПЕРСИО́ННЫЙ дысперсі́йны.

ДИСТАНЦИО́ННЫЙ дыстанцы́йны.

ДИСТИЛЛИРО́ВАННЫЙ дыстыля́ваны.

ДИФФУ́ЗИЯ дыфу́зія, -зыі, *ж*.

ДИЭЛЕКТРИ́ЧЕСКИЙ дыэлектры́чны.

ДЛИНА́ даўжыня́, -ні, *ж*.

ДЛИ́ТЕЛЬНОСТЬ праця́гласць, -ці, *ж*.; **д. склеивания** працягласць склейвання.

ДОБА́ВОЧНЫЙ дадатко́вы.

ДО́ЗА до́за, -зы, *ж*. Пэўная колькасць, норма чаго-небудзь (рэчыва).

ДОЗА́ТОР даза́тар, -ра, *м*. (тэхн.).

ДОКУМЕНТА́ЦИЯ дакумента́цыя, -цыі, *ж*.

ДОЛБ//И́ТЬ дзяўбці́; **~ле́ние** дзяўба́нне, -нне, *ср*.; **~лёный** дзяўба́ны, вы́дзеўбаны.

ДОЛБНЯ́ до́ўбня, -мі, *ж*., даўбня́, -ні, *ж*.

ДОЛГОВЕ́ЧНОСТЬ даўгаве́чнасць, -ці, *ж*.

ДОМОСТРОЕ́НИЕ домабудава́нне, -ння, *ж*.

ДО́ПУСК до́пуск, -ску, *м.*; **~а́емый** дапушча́льны; **~а́емое отклонение** дапушча́льнае адхіленне.

ДОРОГОСТО́ЯЩИЙ дарагі.

ДОРО́ЖЕ даражэ́й.

ДОСКА́ до́шка, -кі, *ж.*

ДОЩА́ТЫЙ дашча́ны, дашча́ты.

ДОЩЕ́ЧКА до́шчачка, -кі, *ж.*

ДРАНЬ дра́нка, -кі, *ж.*, дра́ніца, -цы, *ж.* Тонкія дошчачкі для крыцця даху або абівання сцен перад тынкоўкай.

ДРЕВЕСИ́НА драўні́на, -ны, *ж.*

ДРЕВЕСНОВОЛКНИ́СТЫЙ драўнянавалакні́сты.

ДРЕВЕСНОСТРУ́ЖЕЧН//ЫЙ драўнянастру́жкавы; **~ая плита** драўнянастру́жкавая пліта.

ДРЕВЕ́СНЫЙ драўня́ны.

ДРЕЛЬ дрыль, *род.* дры́ля, *м.*

ДРОБИ́ЛКА драбілка, -кі, *ж.*

ДРОБИ́ЛЬН//ЫЙ драбільны; **~ая машина** драбільная машына.

ДРОБИ́ТЬ драбіць, драбніць.

ДРОВА́ дро́вы, *род.* дроў, *мн.*

ДРОВЯНО́Й САРА́Й дрыво́тня, -ні, *ж.* Месца, памяшканее, дзе сякуць і складваюць дровы.

ДУБИ́НКА дручо́к, -ка, *м.*

ДУБО́ВЫЙ дубо́вы.

ДУ́ПЛИСТЫЙ дуплава́ты.

Е

ЕДИНИ́ЦА адзі́нка, -кі, *ж.*; **е. измерения** адзінка вымярэння.

Е́ДКИЙ е́дкі.

ЕЛЬ е́лка, -кі, *ж.*, яліна, -ны, *ж.*

ЕСТЕ́СТВЕНН//ЫЙ натура́льны; **~ая циркуляция** натура́льная цыркуляцыя.

Ж

ЖЕРДЬ жэ́рдка, -кі, жардзі́на, -ны, *ж.* Доўгі шост з тонкага ствала дрэва.

ЖЁСТКИЙ цвёрды, каля́ны, му́лкі.

ЖЁСТКОСТЬ цвёрдасць, -ці, *ж.*, каля́насць, -ці, *ж.*, му́лкасць, -ці, *ж.*

ЖИ́Д//КИЙ 1. ва́дкі; **ж. газ** вадкі газ; **~кое топливо** вадкае паліва; 2. рэ́дкі.

ЖИДКОВА́ТЫЙ радкава́ты, слабава́ты.

ЖИ́ДКОСТЬ 1. (вещество) ва́дкасць, -ці, *ж.*; 2. (свойство) рэ́дкасць, -ці, *ж.*

ЖИЗНЕСПОСО́БНОСТЬ жыццяздо́льнасць, -ці, *ж.*

ЖИЛИ́ЩЕ жыллё, -лля́ *ср.*.

ЖИЛИ́ЩНО-БЫТОВО́Й жыллёва-бытавы́.

ЖИЛИ́ЩНО-СТРОЙ́ТЕЛЬНЫЙ жылёва-будаўнічы.
ЖУРНА́Л 1. часо́піс, -са, *м.*; 2. журна́л, -ла, *м.*
ЖУРНА́ЛЬНЫЙ 1. часо́пісны; 2. журна́льны.

З

ЗАБИВА́ТЬ забіва́ць.
ЗА́БОЛОННЫЙ абало́нны (бот.).
ЗА́БОЛОНЬ абало́на, -ны, *ж.* (бот.).
ЗАВИ́НЧ//ИВАНИЕ зашрубо́ўванне, -ння, *ср.*; закру́чванне, -ння, *ср.*; **~ивать** зашрубо́ўваць, (завёртывать) закру́чваць.
ЗАВО́Д заво́д, -да, *м.*; **лесопильный з.** лесапільны завод.
ЗАВОДОУПРАВЛЕ́НИЕ заводакіраўніцтва, -ва, *ср.*
ЗАГИ́Б загіб, -бу, *м.*, загін, -ну, *м.*; **~а́ть** загіба́ць, загіна́ць; **~а́ться** загіна́цца, загіба́цца; **~очный** загібачны (техн.).
ЗАГЛО́ХНУТЬ заглу́хнуць.
ЗАГНИВА́//НИЕ загніва́нне, -ння, *ср.*, **~ть** загніва́ць.
ЗАГНИ́ТЬ загнісціся.
ЗАГОТА́ВЛИВАНИЕ *ср.* загато́ўка, -кі, *ж.*, загатаўле́нне, -ння, *ср.*, нарыхто́ўка, -кі, *ж.*, нарыхто́ўванне, -ння, *ср.*
ЗАГОТОВИ́ТЕЛЬ загато́ўшчык, -ка, *м.*, нарыхто́ўшчык, -ка, *м.*; **~ный** загато́ўчы, нарыхто́ўчы.

ЗАГОТО́ВИТЬ загатава́ць, нарыхтава́ць.

ЗАГОТО́ВКА загато́ўка, -кі, *ж.* Паўфабрыкат для вырабу дэталі; незакончаны выраб.

ЗАГРАЖДЕ́НИЕ загаро́да, -ды, *ж.*

ЗАГРУЖА́ТЬ загружа́ць.

ЗАГРУ́Ж//ЕННОСТЬ загру́жанасць, -ці, *ж.*; **~енный** загру́жаны.

ЗАГРУ́ЗКА загру́зка, -кі, *ж.*

ЗАГРУ́З//ОЧНЫЙ загру́зачны; **~чик** загру́зчык, -ка, *м.*

ЗАГРУНТО́ВАННЫЙ загрунтава́ны.

ЗАГУСТИ́ТЕЛЬ загушча́льнік, -ка, *м.*

ЗАДА́НИЕ зада́нне, -ння, *ср.*

ЗАДВИГА́ТЬ засо́ўваць.

ЗАДВИ́ЖКА засо́ўка, -кі, *ж.*

ЗАДЕ́Л (запас полупродуктов, заготовок) задзе́л, -лу, *м.*, запа́с, -су, *м.*

ЗАДЕ́ЛКА зала́дка, -кі, *ж.*, зала́джванне, -ння, *ср.*

ЗА́ДНИЙ за́дні.

ЗАЖА́ТИЕ заціска́нне, -ння, *ср.*, (зажим) за́ціск, -ку, *м.*

ЗАЖА́ТЬ заці́снуць, *мног.* пазаціска́ць.

ЗАЖИ́М за́ціск, -ка, *м.*, заціска́чка, -кі, *ж.*, кля́мар, -ра, *м.*

ЗАЖИМН//О́Й заціскны́; **~о́е ўстройство** заціскно́е ўстройства.

ЗАЗО́Р зазо́р, -ру, *м.*; (щель) шчы́ліна, -ны, *ж.*

ЗАЗУ́БРЕННЫЙ вы́шчарблены, *мног.* павышчэ́рбліваны, вы́зублены, *мног.* павызу́бліваны.

ЗАЗУ́БРИНА шчарбі́на, -ны, *ж.*, зазу́біна, -ны, *ж.*

ЗАЗУ́БРИТЬ (нож) вы́шчарбіць, *мног.* павышчэ́рбліваць.

ЗАКА́З зака́з, -зу, *м.*

ЗАКА́ЗЧИК зака́зчык, -ка, *м.*

ЗАКЛЕПА́ТЬ закляпа́ць.

ЗАКЛЁПКА 1. (действие) заклёпванне, -нне, *ср.*, заклёпка, -кі, *ж.*; 2. (предмет) заклёпка, -кі, *ж.*

ЗАКОНОМЕ́РНОСТЬ заканаме́рнасць, -ці, *ж.*

ЗАКРА́ШИВАТЬ зафарбо́ўваць.

ЗАКРЕПИ́ТЬ замацава́ць, *мног.* пазамацо́ўваць; **з. доску гвоздем** замацаваць дошку цвіком.

ЗАКРУГЛЕ́НИЕ закругле́нне, -ння, *ср.*

ЗАМА́З//КА *ж.* 1. (действие) зама́званне, -ння, *ср.*, (окон) закіто́ўванне, -ння, *ср.*, кітава́нне, -ння, *ср.*; 2. (вещество для замазывания) зама́зка, -кі, *ж.*, (оконная) кіт, *род.* кіту́, *м.*; **~очный** зама́зачны; **~ывание** 1. зама́званне, -ння, *ср.*, (оконной замазкой) закіто́ўванне, -ння, *ср.*, кітава́нне, -ння, *ср.*;

~ывать замáзваць, (оконной замазкой) закітóўваць.

ЗАМÉР замéр, -ру, *м*., абмéр, -ру, *м*., абмéрванне, -ння, ср.

ЗАМЕРЯ́ТЬ замéрваць, мéраць, вымéрваць.

ЗАМÓК замóк, -мка, *м*. Спосаб мацавання, злучэння драўляных дэталей.

ЗАМОРА́ЖИВАНИЕ замарóжванне, -ння, *ср*.

ЗАМЫКА́НИЕ замыкáнне, -ння, *ср*.

ЗА́НАВЕС заслóна, -ны, *ж*.

ЗАНИ́ЖЕННЫЙ зані́жаны.

ЗАОСТР//ÉНИЕ завастрэ́нне, -ння, *ср*.; **~ённость** завóстранасць, -ці, *ж*.; **~и́ть** завастры́ць.

ЗАПА́ЗДЫВАНИЕ спазнéнне, -ння, *ср*., апазнéнне, -ння, *ср*.

ЗАПА́С запáс, -су, *м*.; **~áться** запасáцца.

ЗАПАТЕНТÓВ//АННЫЙ запатэнтавáны; **~ывать** запатэнтóўваць.

ЗА́ПАХ пах, *род*. пáху, *м*.

ЗАПЛАНИ́РОВА//ННЫЙ запланавáны; **~ть** запланавáць.

ЗАПЛА́ТА лáта, -ты, *ж*., лáпік, -ку, *м*. Кавалак матэрыі або скуры, якім зашываюць дзірку ў адзенні, абутку і інш.

ЗАПЛÉЧИКИ заплéчыкі, -каў, *мн*. (техн.).

ЗАПОЛНÉНИЕ запаўнéнне, -ння, *ср*.

ЗАПОРÓТЬ сапсавáць.

ЗАПРА́ВИТЬ 1. уста́віць, улажы́ць; 2. нала́дзіць.

ЗАПРЕССОВА́ТЬ запрасава́ць.

ЗАПРЕССО́ВКА запрасо́ўка, -кі, *ж.*

ЗАПРОГРАММИ́РОВАННЫЙ запраграміраваны.

ЗАПРОЕКТИ́РОВ//АННЫЙ запраектава́ны; **~ать** запраектава́ць.

ЗАПРУ́ДА гаць, *род.* га́ці, *ж.* 1. Насціл з бярвенняў ці галля для праезду праз балота; грэбля. 2. Запруда на рацэ.

ЗА́ПУСК за́пуск, -ку, *м.*, пуск, *род.* пу́ску, *м.*

ЗАПУСТИ́ТЬ запусці́ць; **з. станок** запусціць станок.

ЗАПЧА́СТИ (запасные части) запча́сткі, -так.

ЗАПЫЛЁННОСТЬ запылёнасць, -ці, *ж.*

ЗАРАБА́ТЫВАТЬ зарабля́ць.

ЗАРПЛА́ТА зарпла́та, -ты, *ж.*

ЗАРУ́БКА зару́бка, -кі, *ж.* Метка, зробленая сякерай на бярвене.

ЗАСОРЕ́НИЕ засме́чванне, -ння, *ср.*, забру́джванне, -ння, *ср.*, запару́шванне, -ння, *ср.*, засо́р, -ру, *м.*

ЗАСТЕКЛЕ́НИЕ шкле́нне, -ння, *ср.*

ЗАСТО́ПОР//ЕННЫЙ засто́параны; **~ить** засто́парыць; **~иться** засто́парыцца.

ЗАСТРЕВА́//НИЕ 1. захраса́нне, -ння, *ср.*, завяза́нне, -ння, *ср.*; **~ть** захраса́ць, засяда́ць, вя́знуць, завяза́ць.

ЗАСТЫВА́//НИЕ застыва́ние, -нне, *ср.*; **~ть** застыва́ць.

ЗАТВЕРДЕВА́ТЬ цвярдзе́ць, зацвярдзява́ць.

ЗАТЁС зачо́с, -су, *м.*, зару́бка, -кі, *ж.*

ЗАТЕСА́ТЬ зачаса́ць, *мног.* пазачэ́сваць.

ЗАТОЧИ́ТЬ завастры́ць, (на точиле станка) затачы́ць, *мног.* пазато́чваць.

ЗАТО́ЧКА заво́стрыванне, -ння, *ср.*, зато́чванне, -ння, *ср.*

ЗАТО́ЧНЫЙ зато́чны.

ЗАТО́ЧЕННЫЙ (заостренный) заво́страны; (на точиле) зато́чаны, *мног.* пазато́чваны.

ЗАТРА́ТА затра́та, -ты, *ж.*

ЗАТУ́ПЛИВАНИЕ зату́пліванне, -ння, *ср.*

ЗАУСЕ́НИЦА заву́сеніца, -цы, *ж.*, задзі́рына, -ны, *ж.*

ЗАХВА́Т захва́т, -та, *м.* Прыстасаванне для ўтрымання грузаў.

ЗАЧИ́СТИТЬ зачы́сціць.

ЗАЧИЩА́ТЬ зачышча́ць.

ЗАШЛИФОВ//А́ТЬ зашліфава́ць; **~ывание** зашліфо́ўванне, -ння, *ср.*

ЗАШПАКЛ//ЁВАННЫЙ зашпакліва́ны; **~ева́ть** зашпаклява́ць; **~ёвка** *ж.* зашпаклёўванне, -ння, *ср.*; **~ёвывание** зашпаклёўванне, -ння, *ср.*; **~ёвывать** зашпаклёўваць; **~ёвываться** зашпаклёўвацца.

ЗАЩЁЛКА за́шчапка, -кі, *ж.*

ЗАЩИ́ТА абаро́на, -ны, *ж.*

ЗВУК гук, *род.* гу́ку, *м.*

ЗВУКОИЗОЛИ́РУЮЩИЙ гукаізалю́ючы.

ЗВУКОИЗОЛ//ЯЦИО́ННЫЙ гукаізаляцы́йны; **~я́ция** гукаізаля́цыя, -цыі, *ж.*

ЗВУКОНЕПРОНИЦА́ЕМОСТЬ гуканепраніка́льнасць, -ці, *ж.*

ЗВУКОПОГЛАЩА́ЮЩИЙ гукапаглына́льны.

ЗВУКОПРОНИЦА́ЕМОСТЬ гукапраніка́льнасць, -ці, *ж.*

ЗЕ́РКАЛО лю́стра, -ра, *ср.*, люстэ́рка, -кі, *ср.*

ЗЕРНИ́СТОСТЬ зярні́стасць, -ці, *ж.*

ЗНА́НИЕ ве́ды, -даў, *мн.*

ЗНАЧЕ́НИЕ значэ́нне, -ння, *ср.*

ЗНАЧИ́ТЕЛЬНО зна́чна.

ЗО́ДЧИЙ до́йлід, -да, *м.*

ЗОЛА́ по́пел, -лу, *м.*

ЗО́НА зо́на, -ны, *ж.* Прастора паміж якімінебудзь межамі (безсу́чковая з. дошкі).

ЗУБ зуб, *род.* зу́ба, *м.*; **з. в пиле** зуб у піле.

И

И́ВА вярба́, -бы, *ж.*

ИВО́В//ЫЙ вярбо́вы, лазо́вы, вербало́завы; **~ый прут** лазовы дубец.

ИЗА... іза... Першая састаўная частка складаных тэрмінаў, якая абазначае: роўны,

аднолькавы, напр.: ізабара (лінія на карце, якая злучае месцы з аднолькавым атмасферным ціскам), ізатэрма (лінія на карце, якая злучае месцы з аднолькавай сярэдняй тэмпературай) і інш.

ИЗГИ́Б вы́гіб, -бу, *м*.

ИЗГИБА́ТЬ выгіба́ць.

ИЗГОТ//А́ВЛИВАТЬ (производить) вырабля́ць, рабі́ць; **~овление** (производство) вы́раб, -бу, *м*.

ИЗДАВА́ТЬ (публиковать) выдава́ць.

ИЗДЕ́ЛИЕ вы́раб, -бу, *м*. Прадмет альбо набор прадметаў, які падлягае вырабу і ўключаны ў вытворчую праграму прадпрыемства.

ИЗЛИ́ШЕК лі́шак, -шку, *м*.

ИЗЛУЧА́ТЕЛЬ выпраме́ньвальнік, -ка, *м*.; **~ный** выпраме́ньвальны.

ИЗЛУЧА́ТЬ выпраме́ньваць.

ИЗМЕЛЬЧА́ТЬ (измельчить) драбні́ць; (крошить) крышы́ць; (толочь) таўчы́.

ИЗМЕЛЬЧ//А́ТЬСЯ драбні́цца; (крошиться) крышы́цца; таўчы́ся; **~е́ние** драбне́нне, -ння, *ср*.; крышэ́нне, -ння, *ср*.; таўчэ́нне, -ння, *ср*.; **~ённый** здро́блены, скры́шаны, пакры́шаны, пато́ўчаны; **~и́ть** здрабні́ць, падрабні́ць, (искрошить) скрышы́ць, пакрышы́ць; патаўчы́.

ИЗМЕРЕ́НИЕ вымяра́нне, -ння, *ср*., ме́ранне, -ння, *ср*., выме́рванне, -ння, *ср*.

ИЗМЕ́РЕННЫЙ зме́раны, вы́мераны.

ИЗМЕРИ́ТЕЛЬНЫЙ вымяра́льны, вы́мерны.

ИЗМЕ́Р//ИТЬ зме́раць, вы́мераць, *мног.* павымяра́ць; **~ять** ме́раць, выме́рваць, вымяра́ць, (обмерять) абме́рваць, абмяра́ць.

ИЗНА́ШИВАЕМОСТЬ зно́швальнасць, -ці, *ж.*

ИЗНО́С знос, *род.* зно́су, *м.*; **и. оборудования** знос абсталявання.

ИЗНОСОСТО́ЙКИЙ зносасто́йкі.

ИЗНОСОУСТО́ЙЧИВ//ОСТЪ зносаўсто́йлівасць, -ці, *ж.*; **~ый** зносаўсто́йлівы (техн.).

ИЗОБРЕТЕ́НИЕ 1. (действие) вынахо́дства, -ва, *ср.*; 2. (то, что изобретено) вынахо́дка, -кі, *ж.*

ИЗОЛЯЦИО́ННЫЙ ізаляцы́йны.

ИЗОЛЯ́ЦИЯ ізаля́цыя, -цыі, *ж.*

ИЗРАСХО́ДОВАТЬ зрасхо́даваць, расхо́даваць.

ИЗУЧА́ТЬ вывуча́ць.

ИМИТА́ЦИЯ іміта́цыя, -цыі, *ж.* Перайманне, падробка, якая прымяняецца з мэтай адлюстравання простымі і таннымі сродкамі якога-небудзь складанага альбо дарагога прыёму мастацка-дэкаратыўнай апрацоўкі драўніны.

И́МПОРТ імпарт, -ту, *м.*; **~и́рование** імпартава́нне, -ння, *м.*

ИНВЕНТАРИЗА́ЦИЯ інвентарыза́цыя, -цыі, *ж.*

ИНДИКА́ТОР індыка́тар, -ра, *м.*

ИНЖЕНЕ́Р інжыне́р, -ра, *м.*

ИНКРУСТ//А́ЦИЯ інкруста́цыя, -цыі, *ж.*; **~и́рование** інкруставанне, -ння, *ср.*

ИНСТРУ́КЦИЯ інстру́кцыя, -цыі, *ж.*

ИНСТРУМЕ́НТ інструме́нт, -та, *м.*; **~альный** інструмента́льны.

ИНТА́РСИЯ інта́рсія, -сіі, *ж.* Від інкрустацыі, пры якой у драўляную паверхню ўразаюцца драўляныя дэталі.

ИНТЕНСИ́ВНО *нареч.* інтэнсіўна.

ИНТЕРВА́Л інтэрва́л, -лу, *м.*

ИНТЕРЬЕ́Р інтэр'е́р, -ра, *м.* Унутраная частка памяшкання, архітэктурна і па-мастацку афармленая.

ИСКЛЮЧИ́ТЕЛЬНО *нареч.* выклю́чна.

ИСКУ́ССТВО 1. маста́цтва, -ва, *ср.*; 2. (мастерство) майстэ́рства, -ва, *ср.*, (умение) уме́льства, -ва, *ср.*

ИСПАРЕ́НИЕ 1. (действие) выпа́рванне, -ння, *ср.*, выпарэ́нне, -ння, *ср.*; 2. (испаряющееся вещество) выпарэнне, -ння, *ср.*

ИСПАРИ́ТЕЛЬ выпа́рнік, -ка, *м.* (техн.).

ИСПОЛНИ́ТЕЛЬ выкана́ўца, -цы, *м.*

ИСПО́ЛНИТЬ 1. вы́канаць; 2. здзе́йсніць.

ИСПО́ЛЬЗОВАНИЕ выкарыста́нне, -ння, *ср.*

ИСПО́Р//ТИТЬ сапсава́ць, папсава́ць, пашко́дзіць; **~ченный** сапсава́ны.

ИСПЫТА́НИЕ выпрабава́нне, -ння *ср.*

ИСПЫ́ТАННЫЙ вы́прабаваны, праве́раны.

ИССЛЕ́ДОВА//НИЕ 1. (действие) дасле́даванне, -ння, *ср.*, до́след, -ду, *м.*; 2. (научное сочинение) дасле́даванне, -ння, *ср.*; **~нный** дасле́даваны; **~тель** дасле́дчык, -ка, *м.*; **~тельский** (относящийся к исследованию) дасле́дчы; **~тельская работа** дасле́дчая работа; **~тельский метод** дасле́дчыцкі метад (метад дасле́давання); **~ть** дасле́даваць.

ИСЧЕ́РП//АННЫЙ вы́чарпаны; **~а́ть** вы́чарпаць.

ИТО́Г падраху́нак, -нку, *м.*; вы́нік, -ку, *м.*

К

КАБРИО́ЛЬ кабрыёль, -ля, *м.* Тып ножкі ў стулаў і крэслаў, якія маюць характэрны выгіб і патанчэнне ў напрамку да нізу; улюбёны тып ножкі ў мэблі стылю "ракако".

КАДКА ка́дка, -кі, *ж.*, каду́шка, -кі, *ж.*, (большая) кадзь, *род.* ка́дзі, *ж.*

КАЛЁВ//КА калёўка, -кі, *ж.*; **~очный** калёвачны; **~щик** калёўшчык, -ка, *м.*

КАЛИ́БР калі́бр, -ру, *м.*; **~о́ванный** калібрава́ны; **~ова́ть** калібрава́ць.

КАЛОРИ́МЕТР калары́метр, -ра, *м.*

КАЛОРИ́ФЕР калары́фер, -ра, *м.*; **~ный** калары́ферны.

КА́ЛЬКА ка́лька, -кі, *ж.*

КАЛЬКУЛЯ́ЦИЯ калькуля́цыя, -цыі, *ж.*

КА́МЕРА ка́мера, -ры, *ж.*

КА́МЕРН//ЫЙ ка́мерны; **~ая сушка** ка́мерная сушка.

КАНА́Т кана́т, -та, *м.*

КАНТ (ребро в доске и т.п.) кант, -та, *м.*

КАНТОВА́ТЬ кантава́ць. 1. Абчэсваць (брус, дошку) так, каб атрымаўся кант. Кантаваць бервяно. 2. Пераварочваць што-небудзь з боку на бок цераз кант (на скрыні надпіс: "Не кантаваць").

КАПИЛЛЯ́Р капіля́р, -ра, *м.*

КАПИТАЛОВЛОЖЕ́НИЯ капіталаўклада́нні, -нняў, *мн.*

КАРАНДА́Ш каранда́ш, -ша, *м.*, ало́вак, *род.* ало́ўка, *м.*

КАРБАМИ́Д карбамі́д, -ду, *м.*

КАРБАМИДОФОРМАЛЬДЕГИ́ДНЫЙ карбамідафармальдэгі́дны.

КАРЕ́ТКА карэ́тка, -кі, *ж.*

КАРНИ́З карні́з, -за, *м.* 1. Гарызантальны выступ, які завяршае сцяну будынка або робіцца над вокнамі, дзвярамі. 2. Папярочка над акном, дзвярамі для штораў, парцьер.

КА́РТА ка́рта, -ты, *ж.* Бланк з якімі-небудзь звесткамі (тэхналагічная карта).

КАРТО́Н карто́н, -ну, *м.* Спецыяльная тоўстая папера з вялікай удзельнай вагой; часта бывае шматслойная.

КАТАЛО́Г катало́г, -га, *м.*

КАУЧУ́К каўчу́к, -ку, *м.*

КА́ФЕДРА ка́федра, -ры, *ж.*

КА́ЧЕСТВО я́касць, -ці, *ж.* 1. Сукупнасць уласцівых прадмету характэрных адзнак; тое, што робіць прадмет такім, якім ён з'яўляецца. 2. Ступень прыгоднасці, вартасці. Якасць прадукцыі.

КВАЛИТЕ́Т кваліт́эт, -та, *м.*

КВАЛИФИКА́ЦИЯ кваліфіка́цыя, -цыі, *ж.*

КВАРТИ́РА кват́эра, -ры, *ж.*

КЕДР кедр, *род.* ке́дру, *м.*

КИЛОВА́ТТ-ЧАС кілава́т-гадзі́на, -ны, *ж.*

КИЛОГРА́ММ кілагра́м, -ма, *м.*

КИ́ПА 1. (пачка) стос, *род.* сто́са, *м.*; 2. (упаковочная мера) кіпа, -пы, *ж.*

КИСЛОТА́ кіслата́, -ты, *ж.*

КИСТЬ п́эндзаль, -ля, *м.* Прылада для малявання і фарбавання: пучок шчаціння, якое змацавана з ручкай.

КЛА́ПАН кла́пан, -на, *м.*

КЛАСС клас, *род.* кла́са, *м.* Узровень чаго-небудзь (шурпатасці паверхні).

КЛАССИФИКА́ЦИЯ класіфіка́цыя, -цыі, *ж.*

КЛЕЕВА́Р клеява́р, -ра, *м.*; **~е́ние** клееварэ́нне, -ння, *ср.*; **~ный** клеява́рны; **~ня** клеява́рня, -ні, *ж.*

КЛЕЕВО́Й клеявы́.

КЛЕЕМЕША́ЛКА клеемяша́лка, -кі, *ж.*

КЛЕ́ЕНИЕ кле́енне, -ння, *ср.*

КЛЕЁНЫЙ кле́ены.

КЛЕЕОБРА́ЗНЫЙ клеепадо́бны.

КЛЕ́ЙЛЬНЫЙ клеі́льны.

КЛЕ́ИТЬ кле́іць.

КЛЕЙ клей, *род.* кле́ю, *м.*

КЛЕЙ-РАСПЛА́В клей-распла́ў, *род.* клеюрасплаву.

КЛЁН клён, *род.* клёна и (о древесине) клёну, *м.*

КЛЕНО́ВЫЙ кляно́вы.

КЛЕПА́ТЬ кляпа́ць (техн.).

КЛЁПКА I *ж.* клёпка, -кі, *ж.*, (только действие) кляпа́нне, -ння, *ср.* (техн.).

КЛЁПКА II (бочарная и т.п.) клёпка, -кі, *ж.*

КЛЁПОЧНЫЙ клёпкавы.

КЛЕ́Т//КА кле́тка, -кі, *ж.*; **~очный** кле́тачны.

КЛЕ́ЩИ абцугі, -гоў, *ед. нет.* Прылада для выцягвання цвікоў у выглядзе шчыпцоў.

КЛИН клін, -на, *м.* Завостраны з аднаго боку кавалак дрэва, жалеза.

КЛИНОВИ́ДНЫЙ клінападо́бны.

КО́ЖА ску́ра, -ры, *ж.*

КОЛЕБА́НИЕ хіста́нне, -ння, *ср*.

КОЛЕСО́ ко́ла, -ла, *ср*.; **махавое к.** махаві́к, махавое кола.

КОЛЕЯ́ каляі́на, -ны, *ж*., каляя́, -ляі, *ж*.

КОЛИ́ЧЕСТВО ко́лькасць, -ці, *ж*.

КОЛО́ТЬ кало́ць; **к. дрова** калоць дровы.

КОЛУ́Н калу́н, -на, *м*.

КО́ЛЫШЕК кало́к, -лка, *м*., кало́чак, -чка, *м*.

КОЛЬЦО́ *ср*. 1. ко́лца, -ца, *ср*.; 2. (круг) ко́ла, -ла, *ср*.

КОМБИНА́Т камбіна́т, -та, *м*.

КОМБИНИ́РОВ//АНИЕ камбінава́нне, -ння, *ср*.; **~анный** камбінава́ны; **~анная сушка** камбінава́ная сушка.

КО́МЕЛЬ каме́ль, -мля́, *м*. Прылягаючая да кораня частка ствала дрэва.

КО́МЛЕВЫЙ камлёвы.

КО́МНАТ//А пако́й, -ко́я, *м*.; **~ный** пакаёвы.

КОМО́Д *м*. камо́да, -ды, *ж*. Невысокая шафа з шуфлядамі для бялізны і розных дробных рэчаў.

КО́МПЛЕКС ко́мплекс, -су, *м*.; **~ность** ко́мплекснасць, -ці, *ж*.; **~ный** ко́мплексны. Два і больш вырабы, якія не злучаны зборкавымі дзеяннямі, але прызначаныя для выканання ўзаемазвязаных эксплуатацыйных функцый (напрыклад, набор мэблі для кухні).

КОМПЛЕ́КТ камплéкт, -та, *м.*; **~ова́ние** камплектаванне, -ння, *ср.* Два і больш не злучаных зборкавымі аперацыямі вырабы, але маючыя агульнае эксплуатацыйнае прызначэнне даламожнага характару (напрыклад, камплект зваротнай тары).

КОМПОЗИ́ЦИЯ кампазíцыя, -цыі, *ж.* Пабудова, структура мастацкага аб'екта, які арганізуе кампанент, прыдае прадмету цэльнасць, супадпарадкоўвае яго элементы адзін аднаму і цэламу. Якасць К. прадмета мэблі праяўляецца ў суразмернасці частак і цэлага, зручнасці размяшчэння функцыянальных элементаў, суразмернасці прадмета і яго дэталей чалавеку. Да асобных уласцівасцей К. адносяцца сіметрыя і асіметрыя, маштаб, прапорцыі, рытм, колер і г.д.

КОМПОНЕ́НТ кампанéнт, -та, *м.*

КОМПОНОВА́ТЬ кампанавáць.

КОМПОНО́ВКА кампанóўка, -кі, *ж.*, (действие) кампанавáнне, -ння, *ср.*

КОМПРЕ́ССОР кампрэ́сар, -ра, *м.*; **~ный** кампрэ́сарны.

КОМПЬЮ́ТЕР кампýтар, -ра, *м.*

КОМФО́РТ камфóрт, -ту, *м.*

КОНВЕ́ЙЕР канвéер, -ра, *м.* Прыстасаванне для перамяшчэння вырабаў пры іх апрацоўцы ад аднаго рабочага да другога або для перамяшчэння грузаў.

КОНВЕКЦИО́ННЫЙ канвекцы́йны.

КОНДЕНСА́ЦИЯ кандэнса́цыя, -цыі, *ж.*

КОНДИЦИОНЕ́Р кандыцыяне́р, -ра, *м.*

КОНДИ́ЦИЯ канды́цыя, -цыі, *ж.* Якасць, норма, якой павінен адпавядаць той ці іншы тавар, матэрыял.

КОНДУКТИ́ВН//ЫЙ кандукцы́йны; **~ая сушка** кандукцы́йная сушка.

КОНЕ́ЧН//ЫЙ кане́чны; **~ая влажность** кане́чная вільготнасць.

КОНИ́ЧЕСК//ИЙ кані́чны; **~ая пила** кані́чная піла.

КОНКУРЕНТОСПО́СОБНОСТЬ канкурэнтаздо́льнасць, -ці, *ж.* Здольнасць прадукцыі карыстацца ўстойлівым ці павышаным попытам на рынку сярод іншай прадукцыі аналагічнага вызначэння.

КОНСЕРВА́ЦИЯ кансерва́цыя, -цыі, *ж.* Спецыяльная апрацоўка або стварэнне спецыяпьных умоў для засцярогі ад псавання (К. драўніны).

КОНСО́ЛЬ кансо́ль, -лі, *ж.* Прысценны стол, стальніца і падстолле якога маюць выразна аднабаковую арыентацыю, якая абумоўлена ўстаноўкай стала ўпрытык да сцяны.

КОНСТРУИ́РОВАНИЕ канструява́нне, -ння, *ср.*

КОНСТРУИ́РОВАТЬ канструява́ць; **~ся** канструява́цца.

КОНСТРУИ́РОВАНИЕ ХУДО́ЖЕСТВЕННОЕ канструява́нне маста́цкае, *ср.* Праектная дзейнасць у сферы дызайна, састаўная частка працэсу стварэння новых прамысловых вырабаў, вызначаных для непасрэднага карыстання чалавекам.

КАНСТРУ́КЦЫЯ канстру́кцыя, -цыі, *ж.*; **к. щитовая** канструкцыя шчытавая; **к. брусковая** канструкцыя брусковая; **к. рамочная** канструкцыя рамачная; **к. каркасная** канструкцыя каркасная.

КОНТА́КТНЫЙ канта́ктны; **к. нагреватель** кантактны награвальнік.

КОНТЕ́ЙНЕР кантэ́йнер, -ра, *м.* Ёмістасць для перавозкі грузаў без упакоўкі.

КОНТРА́СТ кантра́ст, -ту, *м.*; **~и́ровать** кантраставáць; **~ный** кантра́стны.

КОНТРО́ЛЬ кантро́ль, -лю, *м.*

КОНТРО́ЛЬНО-ИЗМЕРИ́ТЕЛЬНЫЙ кантро́льна-вымяра́льны.

КОНТРО́ЛЬНЫЙ кантро́льны.

КО́НУСН//ЫЙ ко́нусны; **~ое отверстие** ко́нусная адтуліна.

КОПЁР капёр, -пра́, *м.*

КОПИРОВА́НИЕ капірава́нне, -нння, *ср.*

КОРА́ кара́, -ры, *ж.*; **к. дерева** кара дрэва.

КО́РЕНЬ ко́рань, -ня, *м.*; **к. дерева** корань дрэва.

КОРО́БИТЬ карабаціць, гнуць; **~ся** карабаціцца, гну́цца.

КОРО́БКА *ж.* скры́нка, -кі, *ж.*, (выточеная из дерева) скры́начка, -кі, *ж.*, (спичечная) па́чак, -чка, *м.*; **дверная к.** дзвярныя вуша́кі; **оконная к.** аконная каро́бка.

КОРОБЛЕ́НИЕ караба́чанне, -ння, *ср.*

КОРОБО́К па́чак, -чка, *м.*; **к. спичек** пачак запалак.

КОРООБДИ́Р//КА караабдзірка, -кі, *ж.*, **~рочный** караабдзіра́льны; **~щик** караабдзіра́льшчык, -ка, *м.*, ако́ршчык, -ка, *м.*; **~щица** караабдзіра́льшчыца, -цы, *ж.*, ако́ршчыца, -цы, *ж.* (техн.).

КОРООЧИСТИ́ТЕЛЬНЫЙ караачышча́льны.

КОРОТЬЕ́ караццё, -цця, *ср.* Бярвенні невялікай даўжыні.

КО́РПУС ко́рпус, -са, *м.*

КО́РПУСНЫЙ ко́рпусны.

КОРЯ́//ГА *ж.* корч, *род.* ко́рча, *м.*; **~жистый** карчакава́ты.

КОСЯ́К (дверной) вуша́к, -ка, *м.*

КОЭФФИЦИЕ́НТ каэфіцые́нт, -та, *м.*

КРАН (подъемный механизм) кран, *род.* кра́на, *м.*

КРАН-БА́ЛКА кран-бэ́лька, -кі, *ж.*

КРАСИ́//ЛЬНЫЙ фарбава́льны; **~льное вещество** фарбава́льнік; **~тель** фарбава́льнік, -ка, *м.*

КРА́СИТЬ фарбава́ць, (покрываць слоем краски) малява́ць.

КРА́СКА фа́рба, -бы, *ж.* 1. Рэчыва, якое надае колер прадмету (масляная фарба, сухая фарба). 2. Колер.

КРАСНОДЕРЕ́В//ЕЦ чырванадрэ́ўшчык, -ка, *м.*; **~ный** чырванадрэ́ўны, з чырво́нага дрэ́ва; **~щик** чырванадрэ́ўшчык, -ка, *м.*

КРА́СЯЩ//ИЙ 1. *прич.* які́ (што) фарбу́е (малю́е); 2. *прил.* фарбава́льны; **~ее вещество** фарбава́льнае рэчыва, фарбава́льнік.

КРАШЕ́НИЕ фарбава́нне, -ння, *ср.*

КРЕНЬ крэнь, -ні, *ж.* Загана драўніны ў выглядзе мясцовага пашырэння гадавых слаёў.

КРЕПЁЖ крапёж, -пяжу́, *м.*; **~ный** крапёжны.

КРЕПИ́ТЬ мацава́ць, умацо́ўваць.

КРЕПЛЕ́НИЕ мацава́нне, -ння, *ср.*, умацо́ўванне, -ння, *ср.*

КРЕ́СЛО крэ́сла, -ла, *ср.*; **~крова́ть** *ж.* крэ́сла-ло́жак, -жка, *м.*

КРИВИЗНА́ крывізна́, -ны, *ж.*

КРИВОШИ́П крываш́ып, -па, *м.*; **~ный** крываш́ыпны (техн.).

КРИТИ́ЧЕСК//ИЙ крыт́ычны; **~ая температура** кры́тычная тэмпература.

КРОВА́ТЬ ложа́к, -жка, *м.* Прадмет мэблі для сну. Абавязкова даецца спінка ва ўзгалоўі

і, як правіла, у нагах. У залежнасці ад шырыні можа быць адзінарным альбо двайным.

КРО́ВЕЛЬНЫЙ да́хавы.

